Наш край у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.

1. Работа ў міні-групах. Выкарыстоўваючы карты і картасхемы атласа, матэрыял вучэбнага дапаможніка і афіцыйныя сайты гарадскіх (раённых, абласных) выканаўчых камітэтаў, вызначце:

А. У склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак уваходзіць ваш населены пункт пасля 1991 г.? Ці адбываліся ў гэты перыяд змены ў яго статусе?

Б. Якія прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы працуюць у вашым рэгіёне? Які ўнёсак робіць ваш рэгіён у эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь?

В. Якія перспектывы прамысловага, сельскагаспадарчага і культурнага развіцця вашага рэгіёна?

Прадстаўце вынікі сваёй працы класу, параўнайце з вынікамі іншых міні-груп.

Падрыхтуйце агульную прэзентацыю «Мая малая радзіма ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст.». Параўнайце яе з прэзентацыямі «Мая малая радзіма ў XIX — пачатку XX ст.», «Мая малая радзіма ў 1917–1945 гг.», «Мая малая радзіма ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.». Зрабіце вывад наконт дынамікі развіцця вашага рэгіёна.

2. Экскурсія па родным краі. З дапамогай афіцыйнага сайта Рэспублікі Беларусь Belarus.by (https://www.belarus.by/ru) і планаў экскурсій, распрацаваных вамі пасля вывучэння раздзелаў I–III, складзіце план турыстычнага маршруту па родным краі «Мая малая радзіма ў гістарычнай мінуўшчыне і цяпершчыне».

3. Славутыя землякі. З дапамогай матэрыялаў, змешчаных на афіцыйных сайтах гарадскіх (раённых, абласных) выканаўчых камітэтаў, дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, хто з'яўляецца ганаровымі грамадзянамі вашага горада, раёна або вобласці; узнагароджаны вышэйшымі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Падрыхтуйце паведамленне пра аднаго са славутых землякоў.

4. Мая сям'я. Даведайцеся пра гісторыю сваёй сям'і пасля 1991 г.: як прайшло дзяцінства вашых бацькоў? Якую ролю адыгралі ў іх жыцці гістарычныя падзеі канца XX — першай чвэрці XXI ст.? Які ўнёсак яны робяць у развіццё Рэспублікі Беларусь? Падрыхтуйце прэзентацыю «Я і мая сям'я ў гісторыі суверэннай Беларусі».